# § 14. Тытаны Адраджэння: Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла, Рафаэль

Перыяд з канца XV стагоддзя да канца 20-х гадоў XVI стагоддзя прынята называць *Высокім Адраджэннем*. Параўнальна невялікі перыяд часу з'яўляецца ўнікальным па сваёй маштабнасці і значэнні. Найлепшым чынам яго характарызуюць жыццё і творчасць трох вялікіх майстроў-тытанаў: Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла Буанароці і Рафаэля Санці.

**Леанарда да Вінчы.** Незвычайны талент і дапытлівы розум *Леана́рда да Ві́нчы* дазволілі яму стаць найвялікшым дзеячам Высокага Адраджэння. Яго ўніверсальныя ўменні былі заўважаны ўжо ў 14 гадоў. Ён займаўся мастацтвам — жывапісам, дойлідствам; навукамі — матэматыкай, фізікай, астраноміяй. Іграў на музычных інструментах, пісаў вершы. І вынаходзіў — складаныя механізмы, машыны, лятальныя апараты. Вялікую ўвагу Леанарда надаваў даследаванню анатоміі чалавека і жывёлы. Ён вывучаў будову арганізмаў, работу мышцаў, што пасля дапамагло майстру праўдзіва перадаваць рух і міміку персанажаў мастацкіх твораў.

Свае назіранні за з'явамі навакольнага свету мастак зафіксаваў у шматлікіх накідах і запісах у дзённіках. Яны сведчаць, наколькі важным для майстра з'яўляўся навуковы падыход, у тым ліку ў мастацкай творчасці. Напрыклад, на яго *карціне «Мадонна ў гроце»* паказаны



**Леанарда да Вінчы.**
Накіды з дзённіка (XV ст.)



**Леанарда да Вінчы.**
Мадонна ў гроце (1483—1486 гг.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Леанарда да Вінчы.** Тайная вячэра (1495—1498 гг.)

травы і кветкі. Навукоўцы лічаць, што ўсе віды раслін адлюстраваны мастаком дакладна, яны лёгка пазнаюцца.

Знакамітая *фрэска «Тайная вячэра»*, размешчаная ў *трапезнай манастыра Са́нта-Марыя-дэ́ле-Гра́цые ў Мілане*, да нашага часу поўнасцю не захавалася. Доследы Леанарда з хімічным саставам фарбы і грунту, якія ён упершыню прымяніў у гэтай фрэсцы, не прайшлі выпрабаванне часам. Фарбы пачалі асыпацца яшчэ пры жыцці мастака. І толькі работа рэстаўратараў XX стагоддзя выратавала фрэску ад далейшага разбурэння. Але і ў сённяшнім выглядзе роспіс робіць на гледача незабыўнае ўражанне. У цэнтры кампазіцыі мы бачым Хрыста. Вакол яго размешчаны апосталы. На іх тварах адлюстравана цэлая гама разнастайных пачуццяў — гневу, страху, разгубленасці, выкліканых словамі Хрыста: «Адзін з вас здрадзіць мне». Вобраз Іуды па яркіх дэталях мы пазнаём амаль адразу: постаць рэзка адхілена назад, рукі сутаргава сціскаюць кашэль з грашыма... Ад выяў іншых апосталаў вобраз Іуды аддзяляе лёгкі цень.

Самай загадкавай работай Леанарда прызнана *карціна «Мона Ліза»* (або *«Джаконда»*). Да цяперашняга часу дакладна невядомае імя жанчыны, паказанай на ёй. Па адной з версій, гэта была знатная дама Ліза дэль Джаконда. Асаблівую прывабнасць і адначасова адчуванне таямніцы надае гераіні ледзь прыкметная ўсмешка. Само аблічча напісана ў цёплых тонах, а фон вытрыманы



**Леанарда да Вінчы.**
Мона Ліза (1503—1519 гг.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ў халоднай гаме блакітнавата-зеленаватых адценняў. Але гэты кантраст не пазбаўляе кампазіцыю гармоніі, і глядач быццам не заўважае змены каларыту. Дамагчыся такога эфекту мастаку дазволіла прымяненне аўтарскага прыёму *сфума́та*, у перакладзе з італьянскай мовы — «задымленне». Дзякуючы лёгкай дымцы, якая ахутвае постаць маладой жанчыны, рэзкая змена палітры колераў становіцца ледзь улоўнай. Мастаку імпанавала размытасць колеру і ліній, пры якой формы непрыкметна перацякаюць адна ў адну. Магчыма, ён меркаваў, што гэтая зменлівая няпэўнасць — найлепшы спосаб перадаць у выяве ідэю бясконцага жыцця.

Плаўныя лініі сілуэта і складак адзення маладой жанчыны сугучныя хвалістым абрысам сцежак на дальнім плане. У гэтай карціне, мабыць, упершыню вобраз чалавека паказаны так даверліва і адначасова велічна. Загадкавая ўсмешка Моны Лізы і сёння выклікае здзіўленне. Пра яе напісаны тысячы кніг. Сам мастак пра свой твор адзываўся так: «У мяне атрымалася стварыць карціну сапраўды цудоўную...»

Разгледзьце творы, прадстаўленыя ў параграфе і на дадатковай старонцы. Якое ўражанне на вас зрабілі работы Леанарда да Вінчы?

**Мікеланджэла.** Творчасць *Мікела́нджэла* — вялікага італьянскага скульптара, архітэктара, жывапісца і паэта — геніяльная як для свайго часу, так і на ўсе наступныя стагоддзі. Вобразы яго твораў напоўнены незвычайнай унутранай энергіяй. У сваіх работах ён адлюстраваў галоўную ідэю Адраджэння — безумоўную веру ў прыгажосць і дасканаласць Чалавека.

Першым з мастацтваў Мікеланджэла лічыў скульптуру. Сярод яго шматлікіх работ можна вылучыць статуі рабоў, задуманыя для надмагілля Папы Рымскага Юлія II. Асобнае месца займае *скульптура «Раб, які паўстаў»*. У ёй аўтар перадаў глыбіннае імкненне чалавека да свабоды. Складаны ракурс мужчынскай постаці, якая рве кайданы, гарманічныя прапорцыі цела і сіла духу, адлюстраваная як у выразе твару, так і ў рухах, прымушаюць гледача паверыць, што раб вось-вось скіне путы і пераадолее сваё становішча.

Знакамітым творам, выкананым скульптарам у мармуры, з’яўляецца *статуя Давіда*. Упершыню яна была прадстаўлена публіцы на плошчы Сіньёрыі ў Фларэнцыі. Каласальная скульптура выклікала ў сучаснікаў бурнае захапленне сваёй веліччу і бязмежнай магутнасцю.

Юнак рыхтуецца да важнай бітвы. У адпаведнасці з ідэаламі Адраджэння ён паказаны спакойным і ўпэўненым у сваіх сілах. Выкарыстоўваючы антычныя каноны гарманічнага чалавечага цела, Мікеланджэла дапаўняе іх сваёй трактоўкай. Майстар некалькі павялічыў верхнюю частку цела, каб постаць юнака здавалася больш магутнай. Ствараючы пяціметровую статую, Мікеланджэла ўлічваў, што яна будзе стаяць на пастаменце і позірк гледача будзе ісці знізу.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне





**Мікеланджэла.** Давід (фрагмент) (1504 г.)

**Мікеланджэла.** Раб, які паўстаў (1513—1516 гг.)

Праз дзесяцігоддзе Мікеланджэла атрымаў новы заказ — упрыгожыць роспісамі *скляпенне Сіксці́нскай капэлы ў Ватыкане*. За чатыры гады майстар распісаў скляпенне, у цэнтры якога размясціў дзевяць галоўных кампазіцый. Адной з самых выбітных стала *фрэска «Стварэнне Адама»*, якая ілюструе біблейскі эпізод: «І стварыў Бог чалавека паводле вобраза Свайго...» На ёй паказаны момант, калі Тварэц надзяляе жыццём першага чалавека на зямлі. У імклівым палёце, нібы ў віхуры



**Мікеланджэла.** Стварэнне Адама (каля 1511 г.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

творчай энергіі, ён дакранаецца да рукі Адама, перадаючы яму разам з жыццём і часцінку сваёй творчай моцы.

Работы Мікеланджэла каштоўныя не толькі сваім тэхнічным майстэрствам, але, перш за ўсё, высокай натхнёнасцю, якой надзелены вобразы герояў.

Якія мастацкія прыёмы і тэхнікі запазычыў Мікеланджэла ў антычных скульптараў пры стварэнні статуй «Раб, які паўстаў» і «Давід»?

**Рафаэль Санці з Урбіна.** Самым лірычным аўтарам з трох тытанаў Адраджэння быў *Рафаэль Сáнці з Урбíна*. З яго імем звязваюць уяўленне аб ідэальнай прыгажосці і гармоніі вобразаў, кампазіцыі, рухаў.

Пошук гармоніі выявіўся ў роспісах парадных апартаментаў — станц — у палацы Ватыкана. Найбольш вядомымі з'яўляюцца роспісы *Залы подпісаў*, або *Станцы дэла Сеньятура*, — залы, у якой папа рымскі змацоўваў пячаткай указы. У ёй размешчаны чатыры кампазіцыі, кожная з якіх прысвечана аднаму з бакоў духоўнага свету чалавека. Сярод іх вылучаецца *фрэска «Афінская школа»*. У аснове яе сюжэта — філасофскі дыспут аб адзінстве навукі і рэлігіі. У адной кампазіцыі Рафаэль аб'яднаў самых вядомых мысліцеляў розных краін і эпох. Кожны з іх займаецца сваёй справай — гутарыць, чытае кнігу, чэрціць.



**Рафаэль.** Станца дэла Сеньятура (фрагмент з фрэскай «Афінская школа») (1509—1511 гг.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Жэсты, позіркі і заняткі навукоўцаў паказваюць на тое, што іх філасофскія погляды былі рознымі.

Аднак улюбёным для Рафаэля стаў вобраз Мадонны. Невыпадкова яго называюць «майстрам ясналікіх мадоннаў». Вобразы яго гераінь выключна прывабныя. Але гэтая прывабнасць асаблівая: пакорлівая і цнатлівая, яна нібы свеціцца знутры пяшчотнай любоўю да сына. Адной з самых чароўных мадоннаў Рафаэля лічаць *Мадонну ў крэсле*. Мяркуецца, што яна напісана з простай жанчыны. Менавіта таму замест традыцыйнай вопраткі на Марыі зялёны шаль з махрамі і стракатая хустка на валасах, якія ў той час насілі сялянкі ў валоцах Рыма. Паводле легенды, Рафаэль убачыў гэтую маладую жанчыну з дзіцём на руках, калі яна сядзела на прыступках царквы. Уражаны яе прыгажосцю, ён тут жа захацеў пісаць з яе Мадонну. А паколькі пад рукой у мастака не аказалася палатна, ён выбіў дно з бочачкі, што ляжала побач, і зрабіў накід адразу на ёй.



**Рафаэль.** Мадонна ў крэсле (1513—1514 гг.)

Пазнаёмцеся з жаночымі вобразамі Рафаэля на кампакт-дыску. Як вы думаеце, у чым для майстра заключаецца ідэал жаночай прыгажосці? Ахарактарызуйце адзін з вобразаў.

Мастакі Высокага Адраджэння дасягнулі ў сваёй творчасці найвялікшых вяршынь. Разнастайнасць і гарманічнасць вобразаў, стрыманасць і лаканічнасць сродкаў выразнасці — форм, прапорцый, перспектывы, колеру — абумовілі з'яўленне ўнікальных твораў мастацтва. Праз стагоддзі мы захапляемся не толькі створанымі вобразамі ў цэлым, але і прыгажосцю кожнага фрагмента.

## Пытанні і заданні

1. Успомніце з урокаў мастацтва ў 5-м класе карціну «Сіксцінская Мадонна» Рафаэля. Ахарактарызуйце твор, паказаўшы, як мастак адлюстраваў у ім асноўныя ідэі эпохі Адраджэння.

2. У трыядзе вялікіх майстроў Высокага Адраджэння Леанарда да Вінчы ўвасабляе інтэлект, Мікеланджэла — моц, а Рафаэль — гармонію. Пацвердзіце гэтае выказванне мастацкімі прыкладамі, прадстаўленымі ў параграфе і на кампакт-дыску.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3. Леанарда да Вінчы і Мікеланджэла пакінулі нашчадкам літаратурную спадчыну. Пазнаёмцеся з урыўкамі з іх літаратурных твораў на дадатковай старонцы. Якое ўражанне яны зрабілі на вас? Якія тэмы хвалююць аўтараў?

4. Сфармулюйце некалькі пытанняў да дыскусіі «Сучаснасць тэм і вобразаў твораў Высокага Адраджэння». Правядзіце дыскусію ў класе.

**Творчая майстэрня**

5. Леанарда да Вінчы ў сваіх карцінах сілуэты гераінь часта паказваў на фоне пейзажу. Гэта не выпадкова. Пейзаж з'яўляецца і фонам, і перадачай унутранага стану персанажаў. Звярніце ўвагу на фон у вядомых работах аўтара «Мона Ліза» і «Мадонна ў гроце». Паспрабуйце выканаць фотапартрэт у гарадскім асяроддзі, на прыродзе, у памяшканні. Пастарайцеся, каб вобраз мадэлі адпавядаў фону, выбранаму вамі. Патлумачце сваю задуму.

## § 15. Мастацтва Венецыі: жыццё ў фарбах

У мастацкай культуры Венецыі рэнесансныя ідэі атрымалі своеасаблівую трактоўку. Венецыянскія творцы адкрылі ў мастацтве новую старонку, паказаўшы навакольны свет ва ўсім яго маляўнічым багацці.

**Венецыянская школа жывапісу.** У XV—XVI стагоддзях фарміравалася *венецыянская школа жывапісу*. Венецыянскія мастакі звярталіся ў асноўным да рэлігійных сюжэтаў. Як і ў іншых гарадах Італіі, у Венецыі атрымаў росквіт жанр партрэта. Але ў адрозненне ад сваіх «суседзяў» венецыянцы скіравалі пошукі наватарскіх прыёмаў па іншым шляху. Перш за ўсё развіццё венецыянскага жывапісу было звязана з вызначэннем новых магчымасцей колеравай палітры. Мастакі значна пашырылі каларыстычную гаму і паказалі ўсяму свету, як колер уплывае на стварэнне мастацкага вобраза. Нездарма прадстаўнікоў венецыянскай школы жывапісу эпохі Адраджэння называюць *кала́рыстамі*.

Для ўвасаблення мастацкага вобраза — чалавека ці прадметна-прасторавага асяроддзя — венецыянскія мастакі ўжывалі адмысловую тэхніку нанясення алейных фарбаў. З дапамогай густых аб'ёмных мазкоў яны «ляпілі» чалавечыя фігуры, складкі адзення, мудрагелістыя аблокі або бляск воднай роўнядзі. Дзякуючы *тэхніцы алейнага жывапісу* прадстаўлены мастакамі свет нібы ажываў на палотнах. Кантраст колераў, танальныя пераходы, выразнасць фактуры — усе гэтыя мастацкія прыёмы ўзбагацілі еўрапейскі жывапіс Адраджэння.

Эксперыменты венецыянскіх мастакоў з алейнымі фарбамі не выпадковыя. Фрэскі ў гэтым рэгіёне былі недаўгавечнымі. Чаму? Знайдзіце адказ у інфармацыйных крыніцах.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне